БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраулядь перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. **15 К.**

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.
Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 17. Менск. Пятніца 12 красавіка 1918 г. Год I

Менск 12/IV.

Аб мястэчках.

У Беларусі каля 1000 мястэчак. яны маюць склад жыцця гарадзкі. Тут сцэнтраваны адміністрацыя, юстыцыя, паліцыя, школы, дактары і аптэкі, почта, банк, гандэль, рэмесло, тут адбываюцца базары. Кругом мястэчка разсыпаны паміж лясоу і палеу беларускія нівялічкія вескі, характэрныя у лесістым раёне. У Украіне і Вялікаросії на абшарах стэпей раскідываюцца вескі на тысячы хат. Крытыку жыцця вескі, як малыя арганізацыі ні робяць, тон усяму дасць «горад"—мястэчка.

Стары рэжым і мястэчкі.

Стары рэжым, аграгічываючы жыдоу, каторыя састауляюць палавіну жыхароу беларускіх мястэчак, саусім зацісну развіцце гарадкоу, і давау вырастаць новым каля станцый ж. д. і каля фабрык на весцэ, У Воукаушчыне каля Менска, адзін прыятны губэрнатар выселіу гаспадара лесапільні, жыда, як ні маючаго права жыць у фабрычным паселку і фабрыка закрылася. Дабіцца, напрыклад, пазваленния рабіць базар 1 раз у нядзелю так сама цяжка, як напасць у рай. Калі наканец Міншчына даста ла земскае самоупрауленне, та адразу яно дало пазваленне на 200 базароу.

Гаразкая Рада з 12 чалавек ні мела ніякіх правоу; яны была толькі для таго, каб сабраць казенныя падаткі.

Мястэчкі—цэнтры культуры.

Мы будзем будаваць беларускую дзержаунасць і культуру. Агентамі гэтаго будуць мястэчкі. Трэба іх долей заняцца у першую галаву.

Трэба выдаць закон аб мястэчковым упрауленні, мястэчковых фінансах, гарадзкой будове, вуліцах, вадзе, асвегленні, каналізацыі транспортных спосабах і т. д.

Саюз мястэчак.

Трымаць архітэктара, інжэнера, спэцыялістау і інструктароу адно мястэчка ні можэць. Але колькі мястэчак легка будзе аплачываць гэтых спэцыялістоу.

Зямля у нашых гарадах мае шнураву сыстэму пляцоу патрэбна перэрэзка на квадратную. Найхутчэй трэба зрабіць з'езд мястэчак на усіх гэтых справах.

Зямля і мястэчкі.

Есць м. Чэрэч Магілеуск. губ., ляжыць яно пры вялікім возеры, мейсцовасць маляунічая, Чэрэя гэта моцны гандлевы цэнтр, ало малако вы там ні знайдзеце ні каплі. Кругом мястэчка землі маентка, там некалі жыцелі пасвілі своіх кароу, дзеці пілі млека рана і вечар. Маентак купіу крэсціянскі банк. Мястэчка абіла усе парогі, каб прадалі гэты маентак гарадзкой думе. Пецербург адмовіу, пабіу на дробные хутары і цяпер, Чэрэйцы ні маюць куды і курыцу выгнаць, а дзеці забылі смак малака.

Трэба выдаць закон, каб пэуны район зямлі кругом мястэчка забезпэчен быу за горадам. Па прыкладу Англії, каля мястэчка трэба даваць дарма, альбо на чынш пляцы пад агароды і домік для беззямельных жыцелеу.

Справа устройства мястэчак вельмі пільная, тым больш што пасьля рэвалюцыі і вайны у іх закіпіць жыцце і трэба даць добрыя фірмы і добрыя дарогі для гэтаго. Апрыч саюза земств і гарадоу Беларусі каторы цяпер складаецца павінен быць саюз беларускіх мястэчак. Ен зложыцца з праудзіва тутэйшых людзей; і ні будзе мець нават слабых следоу наезжаго «земгусарства».

На беларускім шляху.

Беларуская падкамісія народнай асьветы.

У Беларускай Падкамісіі Народнае Асьветы Менскай Гарадской Думы, 10-го красавіка пастаноулено мець у Аддзелі Прасьветы Таварышам Старшыні, і Секрэтаром агульнае Камісіі беларусаў, калі старшынею будзе ні беларус.

Кандыдатамі на мейсцо таварыша—выбраны Міхайлоўскі Рак, сэкрэтаром агульнае камісіі Езавітаў, а сэкрэтаром нацыянальнае Камісіі Грыб. У падзяку за працу Даніелевіча назначылі вучыцелям беларусазнаўства пры аднэй школі, якой пасады яшчэ ні існуе.

Цікава, што цяпер на ўсю Управу ні будзе чалавека, які бы часам мог пераложыць на нашую мову абвесткі Думы, бо Езавітаў і Грыб у беларускай літэратуры саўсім нівядомыя людзі. Такім парадкам нашыя міністры, надрукаваўшыя дэкрэт, што мова беларуская абавязковая ў установах, у Падкамісіі робяць тое, каб у Управі нават ні было каму пераклада́ў пісаць па беларуску. Хіба будзе у у Думі асобны тлумач.

І вось, калі ад тымчасоваго сэкрэтара агульнае Камісіі, як беларуса, мала дбаючаго аб стылю расійскім, вымагаюць у пратаколах пекнасьці стылю, нашая падкамісія ад свайго сэкрэтара ні толькі ні патрэбуе пекнаго беларускаго стылю, але нават і простаго знання беларускае мовы.

X.

Агульныя вісткі.

— Паводлуг афіцыяльнаго турэцкаго паведамлення, ад 9 красавіка па Палестынскім фронце туркамі адбіты агнём і контр-атакамі ніпрыяцельскія разведачныя каманды. На Каўказскім фронце туркі узялі г. Бан. На другіх фронтах бэз зьмен.

— «Таймс" паведамляе с Парыжу, што дзьве, а можа нават 4 французскія батарэі стрэляюць у тоя мейсца, на каторым стаяць дальнабойныя нямецкія гарматы. Бомбы з самалётаў сыплюцца туды, як дождж. Гарматы найходзяцца цяпер далека ад свае́й перцай пазыцыі. Яны стаяць цяпер за 74 мілі ад Пар[illegible]жа. Перавозка іх надта ма[illegible] умацованы на рэйка[illegible] Сфатаграфоваць пазыцыю, на[illegible] яны стаяць над та трудна, бо [illegible] ам заўсёды кружацца нямецкія самалёты, у астатні час гарматы стаялі у 8 мілях за нямецкім фронтам, так што каб іх дастаць трэба было французскую цяжкую гармату паставіць ні далей як за 3—4 мілі за французскім фронтам. Немцы стаpанна хаваюць пазыцыю і нікоті ні стрэляюць ў ночы, каб ні выдаць яе бляскам.

— З Гаагі паведамляюць, што амэрыканскі міністр фінансаў пачаў прыгатавання да 3 ваеннай пажычкі. У прамове з гэтай прычыны ён сказаў паміж іншым, што пабеда можа дастацца ні толька перасіленнем. «Амэрыка будзя біцца хоць-бы і да суднаго дня».

— Пішуць з Бэрліну: Амэрыканцы апавешчаюць праз Рэйтэра такія лічбы: Фундушы коаліцыі раўнуюцца 12 мільярдам доляроў. Сума узятых ёю пажычак раўнуецца 4,435 мільен. доляроў. Амэрыканская армія ад 9524 ахвіцэраў і 202.510 солдатаў ўзрасла да 123.801 ахвіцэраў і 1.558·925 салдатаў. Флот ад 4792 ахвіцэраў і 77.946 матросаў, да 21.000 ахвіцэраў і 330.000 матросаў. Ваеннае міністэрство атрымало крэдыт каля $7^1/_2$ мільярдаў доляроў. Выдаткі на флот забралі, 1,881 мільёнаў дол. Куплянo 23 мільёны ручных гранатаў, 725.000 аўтоматычных пісталетаў, чверць мільёна рэвальвэраў, 23 мільёны гранатаў да цяжкіх гармат 240.000 кулямётаў і 3.484000 вінтовак. Пэрсонал лётчыкаў з 65 ахвіцэраў і 1120 салдатаў ўвялічыўся у 100 разоў.

Гэтыя абвешчаныя амэрыканцамі лічбы, аднак інчэ ні паказалі сябе на фронце як сіла паважная і вялікія выдаткі на іх пакуль што ні мелі ніякіх рэзультатаў на практыцэ.

— Супраціў вестак, што нібыто імпэрскі канцлер гр. Гэртлінг меўся ў скорасьці выступіць у Рэйхстагу з новым паведамленнем з Бэрліну даносяць што гэта ніпраўда. Канцлер трымаецца здання што цяперашні момэнт ёсь момэнт дзела а ні слова.

— Паводлуг «Праўды» паведамляюць з Бэрліну, што пачтовая комунікацыя паміж цэтральнымі дзержавамі і Расіяй мае ўзнавіцца ад 1 мая.

Весткі з Украіны.

— У гутарцэ с коррэспондэнтам «Voss. Ztg.» старшыня рады міністраў Украінскай Народнай Рэспублікі Голубовіч сказаў, што ні можна браць за меру даўнейшае сельска-гаспадарчае становішча Украіны, бо цяпер найболей ураджайныя мейсцы Украіны заняты большэвікамі, а да таго рэволюцыйны бэзлад прычыніў вялікія страты.

— Надыходзячая вясна будзіць трывогі ў том сэнсі, што селяне ні пэўныя у будучыну, ні зробяць пасеваў на забраных імі на моцы 3 і 4 унівэрсалаў ад вялікіх землеўласьнікаў грунтах.

Украінскі урад разьвіваючы далей аграрныя законы маецца

Абвестка.

Менская Гарадская Управа гэтым даводзіць да агульнаго ведама, што у Панядзелак 15 красавіка 1918 року а 1 гадзіне у дзень будуць рабіцца устныя таргі і сараунаванне у закрытых канвэртах на гарадзкое менне: жалезо, дрот, каля 15000 цэглы, локомобілі, вазы і пр.

Хто хоча таргавацца на памяненыя матэрьялы той можа аглядаць іх на складзе «Вѣеръ" пры Александроускай чугунцы ад 10 да 3 гадз. у дзень. Да таргоу павінен быць дастаулены залог у 5% црапанованай сумы.

Член Управы
інжэнэр *В. Цывінскі.*
За Дзелавода *Вашчук.*

аддаць селянам зямлю на праве арэнды, з забаронай, натуральна, прадажы яе. Гэта пазволіць ім прыступіць да сяўбы а так сама аткрые магчымасьць для гаспадаркі і вялікім землеўласьнікам. Збор будзе уласнасьцю землеробаў. Урад забясьпечыць адкупную цану.

Да гэтаго часу разам з зімовымі засевамі апрацовано толькі 45% зямлі, але урад асноўваючыся на ідучых ад усюль паведамленнях спадзяецца,а што засевы дойдуць да 80%.

На поўначы веснавыя работы могуць трываць іщчэ каля 3 тыдняў. Горэй на поўдні, дзе вялікарускія агітатары падбураюць народ.

У быдле ёсьць значныя страты, але становішчо ні можна лічыць крытычным.

Весткі с Польшчы.

У пятнадцатой камісіі Палаты паноу, як паведамляюць з Бэрліна, міністр унутраных справау сказау: Маючы на увазе вялікія перавароты зробленныя вайной мы хочам яшчэ раз падаць палякам руку для згоды. Урад робіць гэта толькі праз думку, што знайдзе у палякау адпаведнае рэхо.

— Нядзельныя варшаускія газэты публікуюць урадовае паведамленне прэзыдыуму Рады міністрау: «П.п. міністр Стэцкі і князь Януш Радзівілл выехалі 7 г. м. у Бярэсьце, дзе спаткаюцца з генэралам Довбор-Мусьніцкім для нарады над важнымі цякучымі справамі, каторыя выходзяць з факту падданя корпусу генэрала Довбор-Мусьніцкаго вярхоунай уладзе Найвышшай Рэгенцкай Рады».

— Меськая почта у Варшаве мае у кароткім часе перайсьці пад загад міністэрства унутрэнных справау. Апрача варшаускай почты, таковыя істнуюць у гор. Колішу, Сасноўцу, Ченстахове і Лодзі. Упраулення гэтых гарадоу так сама замераюцца аддаць гэтыя почты над загад ураду.

— Гэбрэйскія радныя т. з. «об'еднаныя» робяць нарады у справе выбароу у Раду панства. Есьць здання, што каб нават злучыліся усе гэбрэйскія партыі ім дасталося-б ні болей аднаго мейсца у Радзе. Але злучэнне німагчыма. Нагул гэбрэі ні чакаюць сабе нічога ні ад Меськай Рады ні ад Рады панства. Пануе перакананне што найлепей калі «аб'еднанныя» саусім зракуцца мейсцау.

Амэрыка і вайна.

ВАШЫНГТОН (Рэутэр). 6IV. На сьвяткаванні гадаушчыны аружнага выступлення Амэрыкі Вільсон 6 красавіка сказау у Бальтіморы вялікую прамову. Між іншым, ен сказау: «Гэта — гадаушчына прыняцця намі вызаву Нямеччыны біцца за свае права жыць вольна і за сьвятые правы мужчын усяго сьвету. Нацыя прабудзілася. Мы ведаем, што вайна будзе вымагаць ад нас найвялікшых ахвяр,—мо' усяго, што мы маем. Амэрыка можэ быць цяпер зусім пераконана, што доля яе залежыць ад канца вайны. Калі вайна будзе праіграна, Амэрыка утраціць свае становішчэ вялікай нацыі і загубіць сваю сусьветную міссію. На нашы міравыя прэдлажэння нямецкіе валадары ясна адказалі, што яны дабіваюцца ні прауды, а панавання і выпаунення сваей волі без прашкод. У Злучэных Штатах нікто ні сумлеваецца аб значэнні таго, што немцы зрабілі у Расіі, Фінляндзіі, Украіне і Румыніі,—і яны зрабілі бы тое самае на заходнім фронці, калі-б іх арміі ні сустрэцілі там цьвердага адпору. Мэта ворагау—бязпорная: гэта —падчыніць сваей волі і сваім амбіцыям усе славянскія народы і утварыць сусьветную дзержаву гвалту, эксплоатацыі і торговага панавання. З гэтай прычыны што нам астаецца? Я яшчэ і цяпер стаю за мір, каторы зраунавау-бы правы сільных і слабых. Але вызву на дуэль—і я, і вы прынімаеце,—і ніхай аб гэтым ведае увесь сьвет, што ен прынят. Нямеччына яшчэ раз даручыла развязку нашае споркі сіле. На гэта мы можэмо даць толькі адзін адказ: адпор, адпор да апошняга, адпор бяз меры і бяз меж, адпор справядлівы і пабедны, каторы верне сілу сусьветнага права і зраунуе уселякае панаванне.

«Wiln. Ztg.» с прычыны гэтай прамовы пішэ.

«Старым фразам Вільсона аб праудзе і праве пярэчыць выступленне проці Голандзіі. Між яго славамі і дзеламі выяуляецца усе глыбейшая нізгодлівасьць. Цяпер ен ясна паказвае, што значыць амэрыканская палітыка і палітыка саюзьнікау Амэрыкі: гвалт над усім, што ім, на сьвеці ні паддаецца. Нямеччына ніколі ні пазволіць узлажыць на сябе ярмо гвалту. Дзеля гэтаго яна і вядзе сваю гэроічную барацьбу». («Гоман»).

Весткі з Расіі.

— Расійскае войска, як піша «Правда» саусім пакінуло тэрыторыю Пэрсіі.

— «Дѣло Народа» піша, што французскі пасол Нуланс і італьянскі дэлля-Торэтта выехалі у Вологду, дзе знаходзіцца амэрыканскі пасол Фрэнсіс.

— У памешканні Колонтай. Дыбенкавой знайшлі дакумэнты даводзячые яе падвойную роль у стасунку да савецкаго ураду і учасьць у проціў-большэвіцкім загаворэ. Проціў яе распачато сьледства.

— Паведамляюць з Масквы, што згодня з распараджэннем Троцкаго і францускаго посла, чэхо-словацкі корпус які адпраўляецца у Францыю аддаў бронь савецкаму ураду. Ахвіцэры корпусу апроч генэрала Дідэрыхса так сама атпраўляюцца у Францыю разам с корпусам.

— Японцы ноччу на 8 г. м. высадзілі войско у Владзівостоку. Места і порт былі акружаны і пасьля заняты.

— Ад 9 паведамляюць адмірал Като зрабіў візіт галаве горада Владзівостока, каторы энэргічна протэставаў проціў дэсанту. Като сказаў, што дэсант зроблены толькі праз пануючую у горадзе анархію і збродні, якія тут дапушчаліся. Сягодня высядзіцца новая лічба войска.

— Глаўны Сібірскі выканаўчы камітэт саветаў выслаў у Владівосток протэст проціў дэсанту японскіх войск і аб'явіў усю Сібір у стане аблогі.

— Расійскі савецкі урад прыказвае саветам Сібіру як найхуйчэй тварыць часьці чырвонай арміі для адпору японцам.

— Паведамляюць з Жэневы ад 8 г. м. што ў Лёндане глядзяць надта нідаверчыва на выступленне Японіі. Ухвалена высадзіць у Владівастоку столькі англічанаў, сколькі высаджэно японцаў, каб такім чынам умажлівіць супольную палітыку коаліцыі.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Універсытэт „западной области“ па пастанове гарадзкога аддзелу народнай прасьветы павінен быць злучаны з народным універсытэтам.

Разумеецца, гэта добра, бо кошт будзе меншы, да і смешна было-б мець у Менску ажно два універсытэты. Але ішчэ важней, што разам з гэтым счэзне ішчэ адно гняздо «западной области»—гэтай ландэраускай спадчыны. Прафэсары-земгусары «западной області ні сьвет, а цемру нясуць у нашу Беларусь.

Падрахунак запасовых прадуктау павінен быць на моцы пастановы гарадзкой думы предстауляны у канцы гэтаго м-ца. Да гэтаго часу усе млыны, прамысловыя склады, заезды, сталовыя, чайныя, каварні і т. п., а так сама прыватныя асобы павінны даць у кантрольны аддзел гарадзкой харчовай камісіі акуратны спісак сваіх запасау, інaчэй 3000 рубл. штрафу.

Выжэйшая музыкальная школа у Менску мае атчыніцца 22-го красавіка. Дырэктарам школы мае быць прафэсар Жураулеу; вучыцелямі і кіраунікамі клясау маюць быць: п. п. Дітман, Варат (ініцыаторы), Маушовіч, Смідовіч, Шапіро, Андога, Саламонау, Гайман, Усьцюжанінова і шмат другіх.

Школа гэта будзе карыстаць с правау б. расійскіх кансэрваторый. Да аткрыцця школы адбудзіцца публічны канцерт у гарацкім тэатры, на каторым выступяць усе сілы будучай музыкальнай школы.

Гэткім чынам у будучыне Менск будзе мець першую беларускую гасударственную кансэрваторыю.

Беларусская выстаука у Вільні і Бэрліне. Гэтымі днямі прыежджалі у Менск беларусазнауца д-р Энке і публіцыста Брамэр, маючые сваей мэтай сабраць у Менску усе матэр'ялы для будучай Беларускай Выстаукі у Вільні, а потым у Бэрліне.

Д-р Энке цік[illegible]ўся, куды дзеліся [illegible] бе[illegible]рускія: архівы, бібліатэкі, с[illegible]цкія паясы, дываны, аб[illegible]зы, манускрыпты і інш.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 11 красавіка 1918 року.

ЗАХАД:

Бітва каля Армантьеру ад 9 красавіка ідзець поўным ходам. Армія генэр. фон-Кваст узяла ангельскія і партугальскія пазыцыі на поўднёвым беразе Ліссы і ўсходнім беразе Лафы.

Пасля заняцця Буагрэне і Нэвшатэля, яна перамагла пры першым ужо наступленні поле пакрытае лейкамі, прыстасаванае дя упорнай абароны, пакрытае нязлічонымі цэлымі годамі умоцоўванымі апорнымі пунктамі, хуторамі, хатамі і купамі дзерэў; пад умелым кіраўніцтвам генэрал-майора Гефэрэ ішчэ вечарам 9/IV быў зроблены пераход праз р. Ліс каля Ба-ст. Морлейтэпантам 370, пешаго палку Грэбінгом. Учора наступленне зацягнулася па іщчэ шырэйшым фронце.

Войско генэрала Вітт фон-Арнім заняло Голебэкэ і прылеглыя ангельскія першыя ліні. Яны заўладалі вескамі каля Мэссэн і баранілі іх ад моцных нападоў непрыяцеля. Блішэй на поўдзень Вастэн яны прайшлі лес Рэгетэрт і дасяглі шоссы Плег-Стэт.

Армія генэрала фон-Кваста перайшла у многіх мейсцах р. Ліс паміж Армонтьерам і Эстэр і вядзе барацьбу з нанова уведзёнымі у бой ангельскімі аддзеламі на поўночн. беразе ракі.

Поўднёвей Эстэр мы пасуваючыся з боям дайшлі да ракі Лавы і мейсцовасьці поўн.-усходн. Бэтюна. Лічба палонных шмат болей за 10000, с паміж іх адзін партугальскі генэрал.

На фронце па абоіх боках р. Соммы і на поўднёвым беразе р. Эз. бойкі агранічываліся, арматнай перастрэлкай і нівялікамі ўчынкамі пяхоты.

На іншых фронтах нічога новаго.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар
фон-Людэндорф.

У арганізацыі выстаукі памагае знаны беларускі дзеяч і вучоны І. І. Луцкевіч.

«Бѣлорусское Слово»—новая газэта у Кіеве—выдавецтва «Бѣлорускої организаціи на Украинѣ» пачала выходзіць с 1 красавіка.

У № 1 есьць стацця праф. Довнар-Запольскаго, граматы і пастановы сэкрэтарыята Беларускай Народнай Рэспублікі і т. п. У тэй-жа газэце друкуецца, што у Кіеу прыехалі дэлегаты беларускія С. А. Рак-Міхайлоускі і А. І. Цвікевіч, каторыя вядуць перагаворы з народнымі міністрамі Украіны аб граніцах з Вялікарасіяй.

У Менск прыехау С. Н. Нікалайчук, б. старшыня Кіеускай Беларускай Рады, якую разагналі большевіцкія камандзеры Рэмнеу і Мурав'еву. Нікалайчука на ст. Новазыбкау большэвікі арыштавалі і толькі дзеля таго, што большевікі самі аттуль уцяклі, яго ні растрэлялі.

Судна-помачны аддзел Л. Р. ж. д. (б. пэнсіонны) закончыу падлік належных служачым вычатоу, укладау і працэнтау, каб-як толькі прыдуць грошы з Масквы, можно было разлічыцца і гэтым закончыць ліквідацыю.

Пачтово-Тэлеграфныя чыноунікі 6-га аддзелу перавозкі почты на жалезных дарогах, эвакуіраванаго у 1915 г. з начальнікам аддзелу Белеускім у Арол,—перабіраюцца цяпер так сама туды. Выезджаюць у Арол і чыноунікі ст. Менск. пачтовых адзелау абедзьвох. ж. дарог, а так сама ст. Палачан, Крывічоу і інш., спадзяючыся папасьці у Арле на почту, чы на якую іншую службу.

Арэндароу зямельных вучасткау п. Ванькoвiча паведамілі, што калі у хуткім часе ні заплацяць, зацягнуушайся праз час вайны, арэнды, та кантракты іх будуць скасованы.

Дэлегацыі харчоваго гарацкога камітэту, якая манілася ехаць на Украіну па прадукты, —дазваленне ні выдана; ехаць могуць толькі асобныя агенты камітэту, каторым бадай чы удасца што зрабіць.

На прадукты, па якія паехалі агенты у нашу губэрнію, —так сама німа чаго спадзевацца, бо менскі раіон канчаецца р. Птыч, за каторай пачынаецца самая жытніца, куды нам дабірацца ужо нельга.

Цэны на кватэры пачынаюць спадаць; чуць на палову гэта і ні дзіва: з Менска шмат выежджае як быушых тутэйшых чыноунікау, так і запісаушыхся на работы у нямечыну; трымаюцца толькі і рукамі, і зубамі, аблізываючыся на ліквідацыю, расійская земгусары.

Хлеб у Менску пакуль што можна дастаць свабодна па 1 р. 70 к. за фунт, але ад 20-га красавіка хлеб будзе выдавацца ужо толькі па бонах.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблата.